БАЖ – гэта
пра медыя,
baj.media

ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ

# СМІ
# Ў БЕЛАРУСІ

№2 (80)
2025



# СМІ Ў БЕЛАРУСІ Ў КРАСАВІКУ – ЧЭРВЕНІ 2025 ГОДА. АГЛЯД

**У красавіку–чэрвені 2025 года Беларуская асацыяцыя журналістаў зафіксавала новую хвалю рэпрэсій супраць журналістаў і іх родных у Беларусі, у прыватнасці:**

- працягваўся крымінальны пераслед медыясупрацоўнікаў: былі вынесеныя 2 новыя прысуды журналістам і 2 прысуды блогерам;
- узмацніўся ціск на незалежных журналістаў унутры краіны, а таксама на сваякоў тых прадстаўнікоў медыя, якія вымушана пакінулі краіну і цяпер працуюць з-за мяжы, асабліва пацярпелі ад вобшукаў і цкавання ў сродках прапаганды рэгіянальныя медыя, што яшчэ працягвалі працаваць у Беларусі;
- узмацняліся цэнзурныя абмежаванні ў інфармацыйнай прасторы Беларусі: за пяць месяцаў 2025 года было заблакавана столькі ж інтэрнэт-рэсурсаў, колькі за ўвесь 2024 год (больш за 3150);
- упершыню была ўжытая блакіроўка доступу ў сацыяльнай сетцы TikTok для карыстальнікаў з Беларусі, якая тычылася акаўнтаў лідараў апазіцыі Святланы Ціханоўскай і Паўла Латушкі.

## Крымінальны пераслед журналістаў

**У зняволенні застаюцца 37 медыясупрацоўнікаў**. У выніку дыпламатычных намаганняў ЗША *быў вызвалены* і вывезены з Беларусі былы супрацоўнік «Радыё Свабода» **Ігар Карней**.

Беларускай судовай сістэмай былі вынесеныя **2 прысуды па крымінальных справах журналістам і 2 прысуды — блогерам**.

Працягваўся крымінальны пераслед медыйшчыкаў у завочным парадку.

Былыя супрацоўніцы навінавага партала Tut.by **Вольга Лойка** і **Алена Талкачова** 26 красавіка *былі ўнесеныя* ў спіс «асоб, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці». Гэта значыць, што завочны прысуд у дачыненні да іх уступіў у сілу, хаця падрабязнасці суда, які распачаўся 4 лютага, дагэтуль невядомыя, паколькі разгляд справы адбываўся ў межах закрытага судовага працэсу.



Сяргей Бяспалаў. Фота: Facebook

2 мая стваральніка Telegram-канала «Мая краіна Беларусь» блогера **Сяргея Бяспалава** *завочна асудзілі* да 18 гадоў пазбаўлення волі і штрафу памерам 42 тысячы рублёў па шэрагу артыкулаў Крымінальнага кодэкса, у тым ліку за змову з мэтай захопу дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам (артыкул 357), арганізацыю масавых беспарадкаў, якія суправаджаліся гвалтам, пагромамі, падпаламі, знішчэннем маёмасці і ўзброеным супрацівам прадстаўнікам улады (артыкул 293) і паклёп у дачыненні да прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (артыкулы 367 і 368).

Блогера **Антона Матольку**, заснавальніка некалькіх Telegram-каналаў, у тым ліку маніторынгавага праекта «Беларускі гаюн», *завочна асудзілі* да 20 гадоў зняволення ва ўмовах узмоцненага рэжыму і штрафу памерам 84 000 рублёў (прыблізна 24 820 еўра), а таксама канфіскацыі маёмасці. Яго абвінавачвалі паводле 13 крымінальных артыкулаў — сярод іншага ў спробе захопу ўлады, экстрэмізме і здрадзе дзяржаве.


Ціна Палынская

*Былі ўзбуджаны* **як найменш 5 крымінальных спраў у дачыненні да журналістаў**, двое з якіх узятыя пад варту: *журналістка з Полацка* **Ціна Палынская** (а таксама яе старэйшая дачка Маргарыта), і неназваны журналіст — жыхар Брэста, *абвінавачаны* паводле артыкула 361-1 Крымінальнага кодэкса (удзел у экстрэмісцкім фармаванні, пад якім маецца на ўвазе Беларуская асацыяцыя журналістаў).

## Ператрусы, затрыманні, іншыя формы ціску

У красавіку беларускія сілавікі ўзмацнілі ціск на журналістаў унутры краіны і на сваякоў тых прадстаўнікоў медыя, якія вымушана пакінулі краіну і цяпер працуюць з-за мяжы. У большасці выпадкаў адбываліся візіты па месцы рэгістрацыі журналістаў-эмігрантаў, у некаторых выпадках яны суправаджаліся вобшукамі на падставе заведзенай крымінальнай справы. За тры месяцы адбыліся **не менш за 7 вобшукаў і 4 затрыманні.**

Так, прадстаўнікі сілавых ведамстваў у Гродне *наведалі* з апытаннем маці журналіста **Валерыя Руселіка**, у Мінску *была апячатаная* кватэра фотажурналіста **Генадзя Верацінскага**.

На дзяржаўным тэлеканале АНТ 28 траўня *выйшаў* сюжэт, які прадэманстраваў чарговую хвалю пераследу прыватных медыя — літаральна адзінкавых, якія яшчэ працавалі ў рэгіёнах Беларусі. Гэтым разам прэтэнзіі да рэгіянальных медыя выказваліся ў сувязі з іх легальным супрацоўніцтвам з нямецкай амбасадай. У відэа згадваліся **«Вечерний Бобруйск»** і яго галоўны рэдактар **Валянцін Сысой**, бабруй-

скае анлайн-выданне **babruisk.info** і яго галоўны рэдактар **Анатоль Санаценка** (быў асуджаны на 15 сутак адміністрацыйнага арышту 31 сакавіка), былы галоўны рэдактар газеты **«Вольнае Глыбокае» Уладзімір Скрабатун**, а таксама горацкая газета **«УзГорак»**. Былі паказаныя фрагменты допытаў супрацоўнікаў гэтых медыя датычна дамоў, заключаных з амбасадай Германіі. Пры гэтым інфармацыйныя рэсурсы некалькі разоў неабгрунтавана называлі «экстрэмісцкімі».


Марына Ментусава. Фота з архіва гераіні

Вядоўца YouTube-шоў «Обычное утро» **Марына Ментусава** *сутыкнулася* з гендэрным гвалтам у Інтэрнэце. Супрацоўнікі набліжанага да сілавых ведамстваў Telegram-канала апублікавалі фэйкавыя аголеныя фотаздымкі з быццам бы створанага ёй акаўнта на порнасайце Pornhub. Гэта была спланаваная акцыя: тыя ж выявы даслалі самой журналістцы з незнаёмага акаўнта ў Telegram наўпрост падчас прамога эфіру, заявіўшы, што яна падае дрэнны прыклад сваёй дачцэ. Відавочна, што такія публічныя дзеянні закранаюць спакой і бяспеку незалежных жанчын-журналістак у цэлым.

## Выкарыстанне «антыэкстрэмісцкага» заканадаўства для пераследу за распаўсюд інфармацыі незалежных медыяў

Працягвалася выкарыстанне антыэкстрэмісцкага заканадаўства для пераследу незалежных медыя і журналістаў.

**На 5 павялічыўся лік медыяпраектаў, прызнаных «экстрэмісцкімі фармаваннямі»** — гэта «група журналісцкага праекта «БюроМедиа» (Аляксандр Ярашэвіч, Вольга Альхіменка, Аляксей Карпека, Ксенія Вязнікоўцава), незалежная беларуская інтэрнэт-радыёстанцыя «Радыё 97», а таксама YouTube-каналы «ЧестнОК» (блогераў Аляксандра Івуліна і Яраслава Пісарэнкі), «Партызанская хваля», «Жизнь-малина» (вядоўца Мікіта Мелказёраў).

Асуджаных па крымінальных справах вайсковага аналітыка, блогера **Андрэя Паротнікава**, журналістку **Паліну Піткевіч**, блогера **Сяргея Бяспалава** *ўнеслі* ў Пералік грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян або асоб без грамадзянства, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці. **Бяспалава** да таго ж *уключылі* ў спіс «тэрарыстаў», які складае КДБ.

Міністэрства інфармацыі Беларусі працягвала папаўненне Рэспубліканскага спісу экстрэмісцкіх матэрыялаў. Сярод шмат якіх іншых у яго былі ўключаныя кніга «Даведнік беларускага журналіста», выдадзеная ў 1999 годзе, акаўнты ў сацсетках 73-гадовай блогеркі Аляксандры Ханевіч, якая жыве ў вымушанай эміграцыі, Telegram-канал вайсковага аналітыка і блогера з Ізраіля Ігаля Левіна, які ўвогуле не выказваўся адносна падзей у Беларусі.

## Блакіроўка анлайн-рэсурсаў

Узмацняліся цэнзурныя абмежаванні ў інфармацыйнай прасторы Беларусі.



Кнігі серыі "Беларускі кнігазбор". Фота з сацсетак выдавецтва

6 чэрвеня міністр інфармацыі Марат Маркаў на мерапрыемстве пад назвай «Медыя сёння: фокус на праўду» ў Гомелі распавёў, што за пяць месяцаў 2025 года **было заблакавана столькі ж анлайн-рэсурсаў, колькі за ўвесь 2024 год (больш за 3150)**. Гэтаксама, паводле яго слоў, **«шкоднымі для нашых дзяцей» былі прызнаныя 110 кніг**, і работа з кіраўнікамі маркетплэйсаў і распаўсюднікамі выдавецкай прадукцыі працягваецца.

Міністр *заявіў*, што ў Беларусі зараз ідзе і нават узмацняецца інфармацыйная вайна, таму *«на інфармацыйным фронце ў дзяржаўных СМІ павінны быць усе віды зброі і інструментаў»*.

У маі Міністэрства інфармацыі *заблакавала* доступ да сайта прыватнай рэгіянальнай газеты «Вечерний Бобруйск» і *вынесла* пісьмовае папярэджанне заснавальніку беларускай тэлепраграмы «Первый музыкальный канал» з прычыны невыканання неназваных «патрабаванняў, вызначаных заканадаўствам аб СМІ».



Фота: freepik.com

Увагу ўладаў прыцягнула самая папулярная ў Беларусі сацыяльная сетка TikTok, якая належыць кітайскай кампаніі ByteDance. 11 чэрвеня ў TikTok *быў заблакаваны* доступ для карыстальнікаў з Беларусі да акаўнтаў лідараў апазіцыі Святланы Ціханоўскай і Паўла Латушкі — гэта першы падобны выпадак.

16 чэрвеня прапагандыст тэлеканала АНТ Ігар Тур, распавядаючы пра тое, як чыноўнікі адгукаліся на крытыку ў сацсетках, *заявіў*, што

цяпер дзяржава будзе рэагаваць на «ныццё» — выяўляць падман і прыцягваць да адказнасці: *«Нагнуць дзяржаву скандалам ужо дакладана ні ў кога не атрымаецца»*. Верагодна, гэта было звязана са шматлікімі відэа, якія набіралі вялікую папулярнасць у TikTok, з крытыкай сацыяльна-эканамічных праблем у Беларусі.

БЕЛАРУСКАЯ
АСАЦЫЯЦЫЯ
ЖУРНАЛІСТАЎ

baj.media

Змест гэтага электроннага выдання абаронены нормамі Аўтарскага права.
Спасылка на «Беларуская асацыяцыя журналістаў» пры выкарыстанні матэрыялаў ЭЛЕКТРОННАГА БЮЛЕТЭНЯ «СМІ Ў БЕЛАРУСІ» з'яўляецца абавязковай.

Кантакт:
Андрэй Бастунец

E-mail: office@baj.media
Web: https://baj.media/be

2025